**20 красавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі пачала працаваць III Мінская міжнародная выстава графікі "Арт-лінія". У экспазіцыі прадстаўлена звыш 160 графічных твораў мастакоў з Беларусі, Украіны, Расіі, Іспаніі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Балгарыі і іншых краін. Выстава наглядна раскрывае вялікі патэнцыял і новыя перспектывы графічнага мастацтва, яго адмысловае месца ў сучаснай сусветнай арт-прасторы.**


Выступае старшыня міжнароднага журы конкурсу — народны мастак Беларусі Георгій Паплаўскі.

# Графіка — мастацтва вытанчанае

Усё-такі, хто б што ні казаў, мастацкае жыццё ў нашай краіне ў апошнія гады набывае ўсё больш відавочныя еўрапейскія рысы. Памятаецца, яшчэ два гады назад, калі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрывалася I Мінская міжнародная выстава графікі "Арт-лінія", яе арганізатары гаварылі больш аб прарыве і сенсацыі, чым аб уласна змесце экспазіцыі. Год назад на адкрыцці II выставы ўжо асцярожна закідваліся зярняты ў будучыню — а мо "Арт-лінія" як зроблены па еўрапейскіх канонах праект у Мінску стане традыцыйнай. Сёлета ж ужо амаль не карысталіся "высокім штылем"...

...труецца нашай публіцы ўпершыню. "Гэта калекцыя, якой мог бы пазайздросціць любы музей, а мы мелі такі цуд і толькі сёння паказваем яго грамадскасці", — заўважыў Фёдар Ястраб. Па яго словах, практыка дэманстрацыі падобных рэт-...


Фелікс Караль. Ілюстрацыя да кнігі М.Касарды "Rebeliáda". 1993 г. Славенія.

ужо амаль не карыстаецца "высокім шты-лем". Куратар праекта, загадчык аддзела галерэйна-выставачнай дзейнасці НББ, старшыня Міжнароднай гільдыі жывапісцаў і член Беларускага саюза мастакоў Фёдар Ястраб проста канстатаваў, што на "Арт-лінію" прыслалі свае творы вядучыя мастакі з шэрагу еўрапейскіх краін, многія прыехалі ў Мінск самі; што ў рамках выстаўкі праходзіць конкурс, вынікі якога ўжо падвяло аўтарытэтнае міжнароднае журы; што ганаровым госцем экспазіцыі сёлета выступае знакаміты графік са Славеніі Фелікс Караль.

Таксама Фёдар Ястраб адзначыў, што ў гэтым годзе ўпершыню ў Мінскую міжнародную выставу графікі ўключана адмысловая рэтрапраграма — наведвальнікі могуць пазнаёміцца з літаграфіямі вядомага англійскага графіка і архітэктара Джозефа Нэша (1809—1878), чые творы ў свой час былі настольнымі не для аднаго пакалення еўрапейскіх мастакоў, актыўна выкарыстоўваліся ў друку, "цытаваліся" многімі творцамі. Да слова, работы Нэша сёння захоўваюцца ў зборах Брытанскага музея, Вэстмінстэрскага палаца. Калекцыя з 47 літаграфій англійскага майстра са збораў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў такім шырокім фармаце дэманс-



Джозеф Нэш. Ілюстрацыя да кнігі эпохі Цюдараў. Сярэдзіна XIX ст. Англія.

практыка дэманстрацыі падобных рэтрапраграм будзе прадоўжана і на наступных "Арт-лініях". Балазе, НББ мае ў сваіх фондах яшчэ вельмі шмат цікавых і каштоўных рарытэтаў з сусветнай мастацкай, у тым ліку графічнай, спадчыны.

Што да ўласна конкурснай праграмы сёлетняй "Арт-лініі", то зноў, як і ў мінулыя гады, вельмі высокі ўзровень паказалі мастакі з Беларусі (Іван Сямілетаў, Міхаіл Бухавец, Андрэй Ярашэвіч, Валянціна Калеснікава, Сяргей Стальмашонак і




Сяргей Стальмашонак. З серыі "Краіна кошак". 2010 г. Беларусь.

інш.), Польшчы (Лукаш Левандоўскі, які прадставіў адмысловую серыю графічных прац, прысвечаных нашай краіне), Эстоніі (Інга Хеамагі), Расіі (Ларыса Кулік). І ўсё ж, як кажуць, весці рэй на "Арт-лініі" ў гэтым годзе выпаў гонар украінскім творцам. Менавіта яны ўзялі галоўныя ўзнагароды конкурсу і менавіта сярод іх твораў былі самыя нечаканыя, смелыя і стыльныя: серыя "Люкі" Дабрыні Іванова, серыя "Птушкі" Уладзіміра Станьковіча, серыя "Мяса. Сімулякры" творцы пад псеўданімам "Садан"... Сапраўдным адкрыццём конкурсу стала семнаццацігадовая ўкраінка Аляксандра Сідарэц, якая яшчэ толькі вучыцца ў Кіеўскай рэспубліканскай мастацкай школе, а ўжо дэманс-



труе майстэрства акадэмічнага ўзроўню. Гран-пры III Мінскай міжнароднай выставы графікі "Арт-лінія" атрымаў за серыю шаўкаграфічных твораў "На ферму да бацькі" Руслан Трэмба, адзін з самых цікавых мастакоў, якіх прадстаўляе канцэптуальная "Я-галерэя" ў Кіеве. Гэта — тры амаль цалкам чорныя працы, якія тым не менш заварожваюць з першага погляду і ўвасабляюць найноўшае элітарнае мастацтва з мноствам самых тонкіх, нечаканых нюансаў, разлічаных на падрыхтаванага гледача.

Падводзячы вынікі работы міжнароднага журы, яго старшыня, народны мастак Беларусі і СССР, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Расійскай акадэміі мастацтваў Георгій Паплаўскі заўважыў, што графіка заўсёды заставалася і застаецца ў баку ад кан'юнктуры, ад таго салоннага мастацтва, якое найлягчэй прадаць. Гэта — у першую чаргу вытанчанае мастацтва. А самі графікі — гэта асобны клан творцаў, у якіх у крыві эстэтыка, дакладнасць, выразнасць. Гэтым графічнае мастацтва і прываблівае. Праўда, упрыгожыць свой інтэр'ер графічным творам можа таксама толькі той чалавек, які валодае эстэтычным густам.

Трэба чакаць, што з кожнай новай "Арт-лініяй" у Беларусі такіх людзей будзе больш і больш...

**Мікола ЧЭМЕР.**
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**